УДК 63.3(2)613(4Беи)
ББК 947.084.63(476)
Ш678

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ імя М. Танка

*Рэцэнзент У. І. Навіцкі*, доктар гістарычных навук, прафесар

Шкуцько Л. Л., Сакалоў М. М.
Ш678 Яўрэйская нацыянальная культура як частка сістэмы народнай асветы на Беларусі ў 1920—1930-я гады: Вучэб. дапам. — БДПУ імя М. Танка, 2001. — 30 с.

У дапаможніку на прыкладзе становішча яўрэйскай нацыянальнай адукацыі раскрываецца распрацоўка і ажыццяўленне нацыянальнай палітыкі на Беларусі ў 1920—1930-я гады. На аснове архіўных дадзеных і навуковых публікацый прыведзены звесткі аб існаванні яўрэйскай адукацыі ў сістэме агульнаадукацыйнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай школы.

Адрасуецца студэнтам вышэйшых навучальных устаноў, а таксама ўсім, хто цікавіцца праблемамі гісторыі міжнацыянальных адносін і адукацыі на Беларусі.

ББК 947.084.63(476)

© Л. Л. Шкуцько, М. М. Сакалоў, 2001
© Вокладка. А. А. Пакала, 2001

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка

Л. Л. Шкуцько,
М. М. Сакалоў

# ЯЎРЭЙСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ КУЛЬТУРА ЯК ЧАСТКА СІСТЭМЫ НАРОДНАЙ АСВЕТЫ НА БЕЛАРУСІ Ў 1920—1930-Я ГАДЫ

*Вучэбны дапаможнік*

Мінск 2001

образом и обслуживание всех прочих культурно-просветительных потребностей населения должно вестись на их родном материнском языке"[1].

Для правядзення ў жыццё названых прынцыпаў нацыянальнай палітыкі існавала патрэба ў спецыяльных структурах улады, якія і былі створаны. Прычым, як адзначалася пазней у Пастанове "Чарговыя задачы КП(б)Б у нацыянальнай палітыцы", асабліва важна было "ўсю работу і мерапрыемствы ў галіне барацьбы з нацыяналістычнымі рэлігійнымі забабонамі праводзіць ад імя партыі рукамі прадстаўнікоў дадзенай нацыянальнасці ці, у крайнім выпадку, — размаўляючых на мове гэтай нацыянальнасці"[2].

Яшчэ ў Часовым Рабоча-сялянскім Урадзе БССР у студзені 1919 г. існаваў Камісарыят нацыянальных спраў, які ўзначальваў Ф. Шантыр. У жніўні 1920 г. пры Цэнтральным бюро КП(б)Б было створана галоўнае бюро Яўрэйскай секцыі. Неабходнасць стварэння такой партыйнай структуры вынікала з нацыянальнага складу самой кампартыі: беларусаў у ёй было 32,4%, яўрэяў 38,8%, рускіх — 24,5%, палякаў — 6,4% ад агульнай колькасці членаў партыі. Яўрэйскія секцыі былі створаны ва ўсіх акруговых, гарадскіх і раённых партыйных камітэтах, ва ўстановах і ведамствах, іх працай на працягу 20-х гг. кіравала Цэнтральнае бюро яўрэйскай секцыі пры ЦК КП(б)Б. У той жа час існавала Польскае бюро пры ЦК КП(б)Б, якое ажыццяўляла сваю дзейнасць праз шэраг мясцовых партыйных арганізацый і савецкіх органаў.

Асноўнай задачай адзначаных нацыянальных органаў было правядзенне ідэалагічнай працы сярод адпаведнага насельніцтва, прапаганда палітыкі партыі, у тым ліку і па нацыянальным пытанні.

У адпаведнасці з пастановай II сесіі ЦВК БССР ад 15 ліпеня 1924 г. была створана спецыяльная дзяржаўная камісія па нацыянальнай палітыцы на чале з З. С. Чарнушэвічам (з мая 1927 г. — А. І. Хацкевічам). Такія ж камісіі былі створаны і пры выканаўчых камітэтах саветаў розных узроўняў. Яны займаліся непасрэдна ажыццяўленнем палітыкі беларусізацыі на месцах.

[1] Практическое разрешение национального вопроса... Мн., 1927. Ч. 1. С. 136.

[2] Там сама. С. 96.



## ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАЛІТЫКА АДНОСНА ЯЎРЭЙСКАГА ПЫТАННЯ Ў 20—30-я ГГ.

Пасля заканчэння грамадзянскай вайны, на X, XII і XIII з'ездах кампартыі былі ўдакладнены прынцыпы, задачы і формы палітыкі РКП(б) па нацыянальным пытанні. Зыходзячы з гэтага, у Беларусі ў 1923—1924 гг. быў распрацаваны комплекс мерапрыемстваў па нацыянальным адраджэнні, які атрымаў назву "палітыкі беларусізацыі".

Пад беларусізацыяй у шырокім сэнсе разумелася развіццё беларускай культуры, вылучэнне беларусаў на партыйную, савецкую, прафесійную і грамадскую працу (так званая "карэнізацыя"), пашырэнне сферы ўжывання беларускай мовы праз перавод на яе дзяржаўнага справаводства, развіццё нацыянальнай адукацыі. Гэта было неабходна таму, што ў рэспубліцы, дзе беларусаў было больш за 80%, беларуская мова выконвала невялікі аб'ём сацыяльных функцый. Як і ў дарэвалюцыйны час, пераважала руская мова. Не знаходзілася месца ў грамадскім жыцці для ўжывання яўрэйскай і польскай моў, хаця прадстаўнікі названых нацыянальнасцей займалі даволі значны працэнт у агульным складзе насельніцтва Беларусі. Новая нацыянальная палітыка павінна была выправіць гэтую гістарычную несправядлівасць.

Першыя спробы правядзення беларусізацыі мелі месца ўжо ў першыя гады пасля ўтварэння БССР. У 1920—1922 гг. народныя камісарыяты адукацыі і земляробства пачалі паступова пераводзіць сваю працу і справаводства на беларускую мову. Але ўжо тады стала зразумелым, што вырашыць складаныя праблемы адраджэння беларускай культуры і нацыі цалкам немагчыма толькі на ўзроўні асобных намаганняў грамадскіх дзеячаў. Неабходна было падняць названую праблему на ўзровень дзяржаўнай палітыкі. Зроблена гэта было на II сесіі ЦВК БССР у ліпені 1924 г.

Разам з беларусізацыяй, якая з'яўлялася дамінантай нацыянальнай палітыкі ў 20-я гг., паколькі яна датычылася інтарэсаў пераважнай большасці насельніцтва, прадстаўнікоў тытульнай нацыі, нацыянальная палітыка прадугледжвала стварэнне належных умоў і для развіцця іншых нацыянальных культур. У гэтым была зацікаўлена сама беларуская нацыя, бо давер да яе з боку нацыянальных меншасцей абумовіў і поспехі самой палітыкі беларусізацыі.

Неабходнасць надаць належную ўвагу яўрэйскаму пытанню ў нацыянальнай палітыцы ў БССР вынікала з наступнага.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ